кстати, в 1917 г на крестьянском съезде 100-процентным голосованием высказались за большевистскую платформу, рабочие (7,89%).

Во-вторых, по партийности: 95,67% – основная масса «врагов народа», – беспартийные, членов КПСС – 3,7%, других партий – 0,35%, членов ВЛКСМ –0,38%.

В-третьих, по образованию: основная масса «врагов» – малограмотные – 42,78% с незаконченным начальным образованием, 25,78% с начальным образованием, неграмотных - 10,47%.

В-четвертых, по национальному составу: белорусы – 60,58%, как «уклонисты» от сталинского пути, поляки – 19,38%, как главные агенты сопредельного государства.

В-пятых, по статьям определения «врагов»: 47,87% - пропаганда и агитация против Советской власти, 28,68% – шпионаж, 26,68% – организационная деятельность против Советской власти, 7,26% – подготовка вооруженного восстания.

В-шестых, по мере наказания: 31,92% – к высшей мере наказания (к высшей мере социальной защиты по Криминальному кодексу 1928 года), 14,45 % – исправительно-трудовые лагеря на 10 лет, 15,92% – исправительно-трудовые лагеря на 5 лет.

Комментарии к этим последствиям сталинщины излишни.

УДК 321

П.В.Дзядзюля, дацэнт

## ЛІТАРАТУРА І ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ

У шырокім паняцці літаратура - гэта ўся пісьменнасць, якая мае грамадскае значэнне. У гэтай якасці яна з'явілася яшчэ на пачатку чалавечай цывілізацыі, калі жыццё народа пачало ўсведамляцца як гісторыя, хоць і ў фантастычных сувязях. Героіка-міфалагічны эпас - гэта і пачатак будучых гістарычных хронік, у якіх апавядалася пра дзейнасць дзяржаўных кіраўнікоў, і будучай мастацкай прозы, з' яўленне якой сведчыла аб якасным скачку ў развіцці чалавецтва.

Своеасаблівай анталогіяй кніг старажытнасці стала біблія, якая складалася на працягу стагоддзяў. Паступовае асваенне кніг бібліі народамі свету стымулявала развіццё чалавечай цывілізацыі, дало магутны штуршок распаўсюджванню пісьменнасці і станаўленню літаратуры, фарміраванню маралі. Усё гэта садзейнічала кансалідацыі рода-племянных саюзаў у дзяржаўныя аб'яднанні, выпрацоўцы прававых норм іх існавання.

У антычным свеце праца мастака, філосафа, літаратара ўсведамлялася і тэарэтычна асэнсоўвалася ў яе спецыфічнасці не толькі ў творчым асяроддзі, але і прызнавалася дзяржаўнымі органамі.

Перыяд станаўлення нацыянальных дзяржаў спарадзіў трактат Дантэ «Аб народнай мове», у якім ён развіваў думку аб стварэнні літаратуры на роднай мове, а не на латыні (Краткая литературная энциклопедия.- М., 1967.-Т.4.- С.326).

Узнікненне літаратуры на беларускіх землях было выклікана патрэбамі дзяржаўнага, культурна-гістарычнага развіцця і непасрэдна звязана са з'яўленнем у Х стагоддзі пісьменнасці. Буйнейшымі культурнымі цэнтрамі гэтага часу з'яўляліся Полацк , Тураў, Смаленск, дзе існавалі ўсе асноўныя віды, жанры старажытнай літаратуры.

Развіццю прыгожага пісьменства ў XIII - XV стст. садзейнічала палітычнае аб'яднанне беларускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім, у якім беларуская мова атрымала статус дзяржаўнай. У рамках гэтай унікальнай дзяржавы завяршылася фарміраванне беларускай народнасці са сваёй адметнай культурай. У гэты перыяд актыўна развівалася дзелавое пісьменства, з'явіліся пераклады твораў зарубежнай літаратуры на беларускую мову.

Эпоха Адраджэння стымулявала важныя зрухі ў культурным, дзяржаўным жыцці беларускага грамадства. У гэты час растуць культурныя запатрабаванні людзей, пашыраюцца сувязі з краінамі Еўропы, узнікае кнігадрукаванне, ствараюцца выдатныя помнікі прававой думкі (Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.), з'яўляюцца новыя віды і жанры ў літаратурнай творчасці.

Унутраныя і знешнія супярэчнасці ў ВКЛ на працягу XVI ст. аслаблялі моц дзяржавы, а міжканфесійныя сваркі зніжалі яе духоўны патэнцыял. Не выпадкова ў гэты час у творчасці пісьменнікаў Беларусі ўзмацняюцца патрыятычныя матывы. Праблемы лёсу Радзімы, удасканалення чалавека і грамадства былі галоўнымі ў літаратуры эпохі Скарыны.

Складаныя грамадска-палітычныя працэсы, якія ўзніклі пасля Люблінскай уніі, падштурхнулі паланізацыю нацыянальнай эліты княства, стварылі ўмовы для выцяснення беларускай мовы з дзяржаўных структур.

З сярэдзіны XIX ст. нарастаюць адраджэнскія тэндэнцыі беларускай літаратуры. Ахвярны подзвіг К.Каліноўскага і распаўсюджванне яго «Мужыцкай праўды» паўплывалі на тое, каб гэтыя тэндэнцыі перараслі ў адраджэнскі патэнцыял беларускай літаратуры. Ідэя нацыянальнай дзяржаўнасці, хоць і не зусім дакладна сфармуляваная К.Каліноўскім,

стымулявала літаратурную творчасць Ф.Багушэвіча, якая прадвызначала своеасаблівы шлях беларускай літаратуры пачатку XX ст.

Рэвалюцыйныя падзеі 1905-1907 гадоў абудзілі цэлую плеяду таленавітых літаратараў, якія групаваліся вакол газеты «Наша ніва». Гэта была дэманстрацыя інтэлектуальнага патэнцыялу беларускага народа, яго магчымасцяў у творчасці і жадання стаць упоравень з другімі народамі.

Найвялікшыя грамадска-палітычныя ўзрушэнні 1914-1920 гадоў спарадзілі ў беларусаў надзеі на будаўніцтва сваёй дзяржавы, горкія разачараванні, душэўны боль пасля падзелу Беларусі. Літаратура адлюстроўвала ўсе адценні грамадскіх настрояў. У гэты перыяд з 'явіліся такія выдатныя творы , як вершы «Пагоня», «Страцім-лебедзь» М. Багдановіча, цыкл вершаў і публіцыстыкі Янкі Купалы і інш.

Большасць беларускіх пісьменнікаў шчыра спадзявалася на будаўніцтва сваёй дзяржавы ў рамках аб'яўленай бальшавікамі савецкай рэспублікі. Палітыка беларусізацыі вызначыла дзяржаўны статус роднай мовы, актывізавала культурна-асветныя працэсы, стварыла магчымасці вывучаць мінулае народа, распрыгоніла інтэлектуальны патэнцыял нацыі.

З эміграцыі вярнуліся і тыя, хто пацярпеў няўдачу пры арганізацыі БНР. У літаратуру прыйшлі дзесяткі маладых талентаў. Разам са старэйшымі яны рабілі многае для духоўнага развіцця народа, умацавання асноў дзяржаўнасці.

Але ў канцы 20-х гадоў, адначасова з ліквідацыяй НЭПа, завяршылася беларусізацыя і пачалася ліквідацыя часткі народа, апоры беларускай дзяржаўнасці - сялянства і інтэлігенцыі. Асаблівую нянавісць партыйных, карных органаў выклікалі пісьменнікі. Хутчэй за ўсё таму, што ўпершыню ў гісторыі Беларусі такая значная колькасць здольных маладых людзей прaніклася ідэяй незалежнасці, магчымасці стварыць нацыянальную дзяржаву, абуджаючы да гэтага мільёны грамадзян.

Ужо ў 1924 годзе прадстаўнік АДПУ Апанскі ў сакрэтнай запісцы сакратару ЦК КП(б)Б даносіў на Янку Купалу, Якуба Коласа, З.Жылуновіча і інш., абвінавачваючы іх у нацыянал-шавінізме, рэлігійных настроях, леванародніцтве. Падобныя абсурдныя абвінавачванні паўтараліся неаднойчы (Платонаў Р.П. АДПУ-НКУС супраць беларускіх пісьменнікаў //Беларускі гістарычны часопіс .- 1994.-№ 3.-С.61).

Большасць беларускіх пісьменнікаў не змагла рэалізаваць свой творчы патэнцыял, іх жыццёвы шлях быў перапынены ў самым пачатку. Ці не ў гэтым крыецца прычына прыкрай для нас з' явы– беларуская літаратура не стала фактам сусветнай культуры.

Відавочна, што і на рубяжы стагоддзяў Беларусь перажывае не просты этап сваёй гісторыі. Упадак духоўнасці, нацыянальнай культуры

тармозіць станаўленне яе суверэнітэту. Літаратура як сродак развіцця і сцвярджэння нацыянальнай самасвядомасці знаходзіцца ў глыбокім крызісе. Ці знойдуцца сілы ў нашага народа выратаваць культуру, захаваць і ўмацаваць суверэнітэт сваёй дзяржавы? Адказ на гэтае пытанне, відаць, зможа даць толькі час.

УДК 947. 6

В.С.Лявоненка, ст. выкладчык

## РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАГА ЎЗРОЎНЮ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ Ў 70-х - ПЕРШАЙ ПАЛ. 80-х гг. XX ст.

На пачатку 70-х гадоў вырашэнне задачы пераводу эканомікі рэспублікі на рэйкі інтэнсіфікацыі партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР разглядала не толькі з пункту гледжання паскарэння развіцця тэхнічнага прагрэсу, але і істотнага павышэння ўзроўню агульнай і прафесійнай адукацыі насельніцтва. Лічылася неабходным паслядоўна павышаць узровень адукацыі і кваліфікацыі працоўных, завяршыць пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі, здзейсніць неабходныя меры па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і рабочых і перападрыхтоўцы кадраў у сувязі з укараненнем новай тэхнікі і паляпшэннем арганізацыі вытворчасці.

Актуальнасць дадзенай праблемы выклікалася і тым, што амаль 30 % рабочых мелі пачатковую адукацыю.

На працягу 70-х гадоў кіраўніцтвам краіны і рэспублікі быў прыняты цэлы шэраг пастаноў, накіраваных на пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі. У 1971-1975 гг. былі здзейснены мерапрыемствы па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы сярэдніх агульнаадукацыйных школ. Праводзілася шырокая праграма будаўніцтва новых школьных будынкаў, прыбудоў, вучэбных кабінетаў і інш. неабходных памяшканняў, аснашчэнне іх неабходным вучэбным абсталяваннем. Карэнная перабудова адбылася ў працоўным навучанні школьнікаў 9-10 класаў. У гэтыя гады пачаўся таксама першы этап пераходу школ на работу па новых праграмах і падручніках, у якіх вызначаліся ідэі развіцця сучаснай навукі, больш поўна выконваўся прынцып політэхнізму ў навучанні і выхаванні моладзі. У праграмах вучэбных прадметаў была павялічана ўдзельная вага лабараторных і практычных заняткаў, працоўнага навучання. У другой палове 70-х гадоў сталі функцыяніраваць вучэбна-вытворчыя камбінаты. Да 1981 г.у БССР быў адкрыты 191 ВВК. У 1985 г.у іх прайшлі працоўнае навучанне 85 % вучняў старэйшых класаў.